**Матырка, В.** Служылі два афганцы / В. Матырка // Лепельскі край. — 2010. — 26 лют. — С. 7.

## СЛУЖЫЛІ ДВА АФГАНЦЫ

Валянцін Святагор і Мікалай Бурлуцкі нарадзіліся і выраслі ў розных рэспубліках былога Савецкага Саюза. Першы служыў прпаршчыкам у верталетнай часці, а другі – афіцэрам-палітработнікам. У Афганістане таксама былі ў розныя часы і з розных месцах, але іх аб´яднала і здружыла Беларусь, дакладней – Заслонава, дзе яны зараз жывуць і працуюць над ушанаваннем памяці тых, хто не вярнуўся з той вайны…

Святагор – распаўсюджанае прозвішча на Гомельшчыне, адкуль родам быў Валянцін. Пасля тэрміновай службы ён вырашыў звязаць сваё далейшае жыццё з арміяй, стаў прапаршчыкам у верталётным палку, які дыслакаваўся ў Баранавічах. Калі ў 1983 годзе прыйшоў загад яму ехаць у Афганістан, жонка якраз нараджала другое дзіця. Паказала ў вакенца раддома сыночка Валодзю, і паехаў Валянцін у далёкі свет.

Часць дыслакавалася ў Кабуле, але па службе даводзілася лётаць па ўсей краіне. Служба ж была даволі спецыфічная: Валянцін быў старшым тэхнікам групы верталётных рухавікоў. На ім і яго групе ляжалі абавязкі па рамонце вінтакрылых машын.

Рамонт рухавіка на верталёце, асабліва ва ўмовах вайны, заключаецца ў замене яго цалкам. У звычайных умовах рухавік верталёта Мі-8 мяняецца тры-чатыры дні, а то і тыдзень. На вайне ж вельмі важна, каб пастаянна на пагатове стаялі баявыя машыны. Таму ў дзеючую армію без абмежаванняў накіроўвалі запчасткі і агрэгаты, туды ж ішлі найбольш падрыхтаваныя кадры. Рамонтная брыгада Валянціна Святагора мяняла рухавік за дзень! Раніцай падбіты верталёт дастаўлялі на рамонтную пляцоўку, а ўвечары ён ужо ўзлятаў. Часцей жа за ўсё рухавікі выходзілі са строю не з-за душманскіх ракет і снарадаў, а з-за пылу і пяску. За няпоўныя паўтара года старшы прпаршчык памяняў 98 рухавікоў, не лічачы іншых вузлоў і агрэгатаў.

Сын пасля вяртання бацькі некаторы час баяўся падысці да «незнаемага дзядзі». Праўда, потым прывык. Пасля Афгана была Германія, потым Кольскі паўвостраў і, урэшце, Заслонава.

***

Маёр Мікалай Бурлуцкі ў Афганістане служыў нампалітам артылерыйскага дывізіена 101-га мотастралковага палка ў 1983–1985 гадах. Служыў разам са старшынёй раённай арганізацыі ветэранаў-афганцаў Сяргеем Крывялём прыкладна ў адзін час. Сустрэліся праз 20 гадоў пасля вываду войскаў, не пазналі адзін аднаго, толькі потым успомнілі агульных знаёмых, камандзіра палка Героя Савецкага Саюза Няверава.

– Успамінаецца, як мы вярталіся дадому. Прыбылі на Кабульскі аэрадром. Да нашага самалета «Ту» было яшчэ некалькі гадзін, а тут рыхтуецца да хуткага ўзлету грузавы «Іл». Мы да пілотаў, маўляў, падвядзіце нас, неахвотна чакаць. Тыя пагадзіліся. Мы ўзрадаваліся, ды раптам «Іл» затрымалі. Пакулі чакалі, наш самалет узляцеў, мы толькі хвост яго ўбачылі. Праз колькі часу ўзляцелі і мы. Сядзім адны ў вялікім грузавым адсеку на адкідных крэслах для дэсанту, раптам як зараве сірэна! Мы ў паніку – няўжо абстрэл? Аказалася, традыцыя ў лётчыкаў – пры вяртанні

даваць сірэну. Прызямліліся ў Ташкенце. Пакуль чакалі ў Кабуле, самалет Ташкент – Масква жо ўзляцеў, давялося зноў чакаць. Вось у што нам вылілася жаданне паспяшацца.

**Васіль Матырка**